# Песня і слова пра Радзіму

## Якія розныя мы ні былі б, аб'ядноўвае нас любоў да Беларусі: па краіне ярка крочыць фестывальнае лета

Немаведама чаму, але высокае і яснае чэрвеньскае сонца абуджае ў нас спрадвечную цягу да вандровак у новыя і вядомыя ўжо мясціны, да баўлення часу на прыродзе, да сузірання прыгажосці, сустрэч з сябрамі і вяртання да глыбокіх каранёў асабістай і радавой памяці.

Можа, таму многія з беларускіх фестываляў адбываюцца ў рэгіёнах і менавіта ў чэрвені. У Паставах – музычнае свята «Звіняць цымбалы і гармонік», заснаванае народнымі артыстамі Міхаілам Казінцом і Міхасём Дрынеўскім. У Оршы – унікальны фестываль ільну. У Нясвіжы – «Музычныя вечары Вялікага тэатра ў замку Радзівілаў», у Кушлянах на Смаргоншчыне – фэст паэзіі Францішка Багушэвіча. За тры дзесяцігоддзі нашай незалежнасці кожны куток Беларусі прачнуўся ад векавога культурнага сну, усвядоміў сваю адметнасць і рушыў наперад, абганяючы ў нечым нават сталіцу.

Найбуйнейшыя з чэрвеньскіх культурных форумаў – гэта, канечне ж, фестываль нацыянальных культур у Гродне і Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі ў Маладзечне. Абодва маюць за сабой гісторыю, якая цягнецца яшчэ з 1990-х гадоў. Абодва дасягнулі ўжо агульнанацыянальнага ўзроўню. Фестываль у Гродне яскрава дэманструе нашу беларускую шматэтнічнасць. Маладзечанскі ж фэст паказвае, што па-над этнасамі, веравызнаннямі, рэгіянальнымі культурамі і звычаямі, па-над прафесіяй, узростам і жыццёвым досведам мы адзін народ, і наша народнае адзінства мацнее з кожным годам. Асабліва адчуваецца ўсё гэта сёлета, у Год гістарычнай памяці, якому і прысвечаны абодва фестывалі.

### Аваранкі для мядзведзяў

Такой смакатой гараджан і гасцей частавалі ў апошні дзень фестывалю ў Гродне.

– Хачу, хачу! – нават сталыя людзі тут, на гастрафэсце, быццам здзяцінелі.

Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур прайшоў ужо ў трынаццаты раз, і ўпершыню гастрафэст

**Падчас урачыстага шэсця на XIII Рэспубліканскім фестывалі нацыянальных культур у Гродне**






**З удзелам старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталлі Качанавай у межах XIII Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур адбыўся круглы стол «Беларусь – наш агульны дом: адзінства нацый і пакаленняў»**

адбываўся ў вельмі гожым месцы – на Аўгустоўскім канале, дзе так любяць адпачываць і гродзенцы, і турысты.

Апрача аваранкаў, шчодрыя гаспадары прапаноўвалі дранікі, сала, юшку і медавуху.

Але галоўная сенсацыя – аваранкі.

– Ці ведаеце, чаму яны так называюцца? – пытаецца дзяўчына з аваранкам у руцэ. – Бо іх спачатку вараць! Пачастунак гатавалі для ручных мядзведзяў, каб было чым падлашчыць іх на кірмашах.

Можа, праўда, а, імаверна, байка. Любіць наш народ выдумляць гэткія фантастычныя апавяданні! Зрэшты, гісторыкі вам раскажуць, што ў Смаргоні насамрэч існавала славутая на ўсю Еўропу школа мядзведзяў, дзе іх рыхтавалі для кірмашовых забаў.

*«Мы захоўваем спрадвечныя каштоўнасці і звычаі, узбагачаючы адзін аднаго творча і духоўна».*

Фестываль у Гродне нечым падобны на старадаўні кірмаш. Чаго тут толькі няма! І ежа, і танцы, і песні, і гульні, і разнастайныя вырабы народных майстроў. І гасціннасць, і вельмі прыязны творчы настрой.

Сёлета радасць гродзенцаў з нагоды фестывалю біла праз край, бо чатыры гады яго не было. Засумавалі. Прывыклі ўжо, што кожны цотны год у горад над Нёманам з´язджаліся тысячы гасцей, у тым ліку з блізкага замежжа, якое лічылася на той час прыязным да нас, амаль сяброўскім. У 2018 годзе, паводле афіцыйных крыніц, фестываль наведала каля 270 тыс. чалавек.

І раптам пандэмія… забароны. У 2021-м абмяркоўвалася ідэя правесці фестываль у Мінску, але абласныя ўлады сталі гарой: не аддадзім! І вось, нарэшце, шчаслівае вяртанне. Ці, калі хочаце, свята перамогі над абставінамі, што змусілі адкласці гродзенскі фэст у 2020-м.

Цікава, дарэчы, што падрыхтоўка да яго пачалася яшчэ ў верасні 2021-га, калі лютавала «дэльта» і не было ніякай упэўненасці, што пандэмія адступіць. Але людзі спадзяваліся і верылі – як бачым, нездарма.

Што ж такое Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур? Адкуль ён чэрпае энергію і натхненне?

З ідэі, што беларускасць – гэта нешта значна шырэйшае за нашы звычайныя ўяўленні. Што гэта, папершае, культура ўсіх этнасаў, якія спакон вякоў жывуць на нашай зямлі і запазычваюць адзін у аднаго словы і песні, стравы і элементы касцюма, традыцыі і звычаі. Калі ўважліва паглядзець, дык у беларускай мове шмат слоў з ідыш (а не з нямецкай), бо менавіта ідыш гучаў калісьці ў беларускіх гарадах і мястэчках. І наадварот, у ідыш хапае спрадвечна беларускіх слоў. А, па-другое, гэта яшчэ і культуры былых рэспублік СССР, адкуль прыязджалі да нас будаваць прадпрыемствы, узнімаць беларускую навуку, адукацыю, культуру. І, нарэшце, у беларускі культурны абсяг арганічна

ўваходзяць культуры далёкіх, часам экзатычных краін, якія дасылаюць нам сваіх студэнтаў, будаўнікоў ды іншых спецыялістаў.

Дзе, як не на фестывалі нацыянальных культур, мы можам усе спаткацца і разам адсвяткаваць наша сваяцтва, наша непадабенства?! Ды, не выязджаючы за мяжу краіны, пашырыць свой культурны кругагляд?

Як падкрэсліў у сваім звароце да ўдзельнікаў і гасцей фестывалю Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, «гэта яркая падзея сімвалізуе гістарычную пераемнасць традыцый народаў свету, адлюстроўвае адкрытую і міралюбівую палітыку сучаснай Беларусі. Аб´яднаўшы ў адзінай нацыянальнай сям´і людзей самых розных культур і веравызнанняў, мы захоўваем спрадвечныя каштоўнасці і звычаі, узбагачаючы адзін аднаго творча і духоўна». Падобную думку, вітаючы публіку на цырымоніі адкрыцця, выказаў і старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Каранік:

– Фестываль за сваю больш як дваццаціпяцігадовую гісторыю стаў сімвалам міжнацыянальнага міру, згоды і адзінства на беларускай зямлі. Нядзіўна, што ідэя яго правядзення нарадзілася менавіта на гродзенскай зямлі, дзе ў міры і згодзе пражываюць 94 нацыянальнасці і народнасці, узбагачаючы і дапаўняючы адна адну. Нехта мудры сказаў, што добра быць іншым, бо падобныя людзі не змогуць дапоўніць адно аднаго. Якімі б рознымі мы ні былі, нас аб´ядноўвае адно – любоў да роднай Беларусі.

Незвычайна і яскрава, на мой погляд, што кожная з 30 дыяспар, удзельніц сёлетняга фестывалю, выбрала ў якасці сімвала пэўную кветку. У азербайджанцаў, напрыклад, гэта квітнеючы гранат. Юныя прыгажуні падчас урачыстага шэсця па вуліцы Савецкай неслі іх на чале нацыянальных калон.

Гэтыя ж кветкі красаваліся ў арнаментах, у аздобе нацыянальных падворкаў, якія сталі сэрцам свята. Тут адбываліся галоўныя падзеі. Усё астатняе – прыгожы і смачны гарнір да галоўнай стравы.

***«Якімі б рознымі мы ні былі, нас аб´ядноўвае адно – любоў да роднай Беларусі».***

Самы вялікі падворак, як заўжды, беларускі. Традыцыйна ён займаў амаль усю плошчу Леніна. Крыху меншыя падворкі армян, грузін, яўрэяў, карэйцаў, малдаван, палякаў, рускіх, украінцаў, чувашоў размясціліся на іншых вуліцах. І паўсюль танцуюць, спяваюць, заманьваюць ласункамі:

– Заходзьце, мы вам вельмі рады!

Дыяспары, дзе аказалася няшмат прадстаўнікоў, аб´ядналіся і разам прадстаўлялі свае культуры. Азербайджанцы з туркамі, дагестанцы з палесцінцамі, індыйцы з ланкійцамі, татары з башкірамі і мардвінамі, італьянцы з немцамі, эстонцамі, літоўцамі і грэкамі, афганцы з іранцамі, казахамі, кітайцамі, туркменамі і ўзбекамі – усяго 17 нацыянальных падворкаў. Іх лёгка было адшукаць, бо фестывальная навігацыя заслугоўвае самых добрых слоў.

Міністр культуры Анатоль Маркевіч назваў сёлетні фестываль самай яркай культурнай падзеяй у жыцці

**Фестывальны Гродна**







На ўрачыстым адкрыцці XXI Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі



Спяваюць «Песняры»

краіны. Ён падзякаваў усім, хто на працягу фестывальных дзён дарыў добры настрой, творчасць і майстэрства, выклікаючы непадробнае захапленне гледачоў.

– Кожны з нас пачуваў тут як дома, – заўважыў Анатоль Мечыслававіч. – Упэўнены, што творчыя межы фестывалю будуць пашырацца.

Хай прыязджаюць прадстаўнікі дыяспар і нацыянальных абшчын з розных куткоў нашай агульнай Радзімы, няхай паказваюць сябе і сваю культуру, сябруюць, вучацца адно ў аднаго – гэтыя думкі гучалі лейтматывам у апошні фестывальны дзень. І семінар па нацыянальных культурах у межах фэсту быў бы дарэчы.

Напэўна, так яно і будзе, бо гэта натуральны і заканамерны шлях развіцця фестывалю са шматгадовай гісторыяй і традыцыямі.

## Чым багаты, альбо Не песняй адзінай...

Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі ў Маладзечне сёлета размяняў трэці дзясятак. І мо нават болей, чым заўсёды, здзівіў колькасцю культурных падзей.

Арганізатары пастараліся тэматычна ахапіць усё: і Год гістарычнай памяці, і 140-годдзе з дня нараджэння класікаў айчыннай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа, і юбілей бацькі маладзечанскага фестывалю Міхаіла Фінберга, які ў снежні пакінуў гэты свет.

«Чым багаты, тым і рады!» – звычайна кажуць гаспадары. У Маладзечне хапае ўсяго, чым можна пахваліцца.

Скажу шчыра, разгубілася. Адначасова ў розных лакацыях адбывалася па тры–чатыры мерапрыемствы. Прычым гэта менавіта падзеі, а не проста святочныя забавы. Хочацца і туды і сюды, але каб паспець усюды, трэба хіба сябе кланаваць. Арганізатары зрабілі ўсё магчымае, каб «Маладзечна-2022» стаў адначасова народным святам і фестывалем мастацтваў. Прычым і свята, і мастацтва з кожным годам становіцца ўсё больш.

***«Не пужайцеся словазлучэння „духоўная музыка“. Яна даступная, яна адухаўляе і вядзе за сабой».***

Заўважная асаблівасць сёлетняга форуму – актыўны ўдзел творчых саюзаў. Найперш Беларускага саюза кампазітараў, але таксама творчых аб´яднанняў пісьменнікаў і мастакоў.

– Саюз кампазітараў, на мой погляд, сёлета займае годнае месца, – пацвердзіла мае назіранні старшыня саюза Алена Атрашкевіч. – Адметна, што гэта не толькі канцэрты эстраднай песні, але і іншай музыкі.

Упершыню на фестывалі – праект саліста Вялікага тэатра Беларусі, лаўрэата міжнародных конкурсаў Дзмітрыя Шабеці «Беларускі раманс», на рэалізацыю якога не так даўно быў выдадзены грант Прэзідэнта. Здаецца, рамансы пад раяль на фэсце ў Маладзечне яшчэ не гучалі.

Ці канцэрт духоўнай музыкі ў касцёле Святога Юзафа. Самае цікавае ў гэтай гісторыі тое, што кампазітары самі

спявалі хорам сваю ж музыку! Ансамбль Беларускага саюза кампазітараў Concertino склаўся пару гадоў таму, кіруе ім выдатны хормайстар, дырэктар Мінскага музычнага каледжа імя М. Глінкі Аляксей Іванавіч Снітко.

***«Паглядзіце, які тут парадак і эстэтыка, якое беражлівае стаўленне да культуры і да людзей!»***

– Не пужайцеся словазлучэння «духоўная музыка». Яна даступная, яна адухаўляе і вядзе за сабой, – заклікала публіку Алена Атрашкевіч перад канцэртам.

Але дарэмна хвалявалася кіраўнік творчага саюза: удзячныя слухачы дружнымі воплескамі віталі аўтараў-выканаўцаў.

– Гэта адпачынак для душы! – прызнаецца Вольга з Вілейкі. – Шчасце, што я сюды прыехала!

Цікава і тое, што маладыя эстрадныя выканаўцы паспяхова выступаюць у суправаджэнні сімфанічнага аркестра Маладзечанскага музычнага каледжа імя Агінскага. Увогуле, эстрадная песня ў Маладзечне даўно гучыць у выкананні акадэмічных, нават оперных спевакоў, але ўпершыню гэта вылілася ў асобныя праекты. Такія, як, напрыклад, «Маладыя галасы Беларусі».

– У нас шмат таленавітых маладых людзей, і я вельмі задаволены тым, што яны паспяхова развіваюцца, – гаворыць мастацкі кіраўнік аркестра, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Рыгор Сарока.

– Магчыма, не ўсё ідэальна па гукарэжысуры, – заўважае ў размове са мной народны артыст Беларусі Леанід Захлеўны. – Усё ж вельмі важна захаваць жывыя галасы.

Вядомы кампазітар па-добраму ўражаны ўзроўнем сёлетняга фестывалю. А заслужыць пахвалу Леаніда Канстанцінавіча вельмі няпроста.

– Я з самага першага форуму тут бываю, – гаворыць ён. – Памятаю яшчэ, як знакамітую песню «Янка Купала» Уладзіміра Будніка спяваў Уладзімір Кудрын.

Сёлета яе выконваў саліст Вялікага тэатра Беларусі Андрэй Мацюшонак.

– Песня з вялікімі традыцыямі і нацыянальнымі каранямі, – лічыць Уладзімір Захлеўны, – спяваць яе трэба так, каб мурашкі беглі па скуры.

Увогуле ў Маладзечне яму падабаецца ўсё:

– Паглядзіце, які тут парадак і эстэтыка, якое беражлівае стаўленне да культуры і да людзей!

Яшчэ адзін новы фестывальны праект – «Музычны Алімп», падчас якога ўганаравалі аўтараў вядомых беларускіх песень – кампазітараў і паэтаў.

***«На сцэне адразу відаць, хто справіўся, а хто крыху разгубіўся, хто ў сабе няўпэўнены».***

– Вельмі ўдзячныя міністру культуры Анатолю Маркевічу за падтрымку, – гаворыць Алена Атрашкевіч. – Спадзяюся, гэта стане традыцыяй – штогод на нацыянальным фестывалі ўзнагароджваць кампазітараў, якія на працягу года заявяць пра сябе ў самых розных напрамках.

«…Час гаворыць з намі, мінулае, сучаснае, будучае… XXI век – гэта адлік новага часу. XXI фестываль –



**Сёння цяжка ўявіць фестываль без салістаў Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Рэспублікі Беларусь, якім доўгія гады кіраваў Міхаіл Фінберг**



Гран-пры Нацыянальнага конкурсу выканаўцаў беларускай эстраднай песні на XXIII Нацыянальным фестывалі песні і паэзіі ў Маладзечне заваявала магіляўчанка Ганна Рыбакова. На здымку: Ганна Рыбакова і старшыня журы конкурсу Максім Расоха

яшчэ адзін крок у будучыню. Пачатак новай гісторы на новым шляху», – прагучала на ўрачыстым адкрыцці «Маладзечна-2022».

На сёлетнім фестывалі адбыўся дэбют выдатнага музыканта Максіма Расохі ў якасці мастацкага кіраўніка і галоўнага дырыжора Нацыянальнага акадэмічнага аркестра сімфанічнай і эстраднай музыкі, калектыву, без якога нельга ўявіць свята музыкі і паэзіі ў Маладзечне. Бо з ім і яго легендарным кіраўніком Міхаілам Фінбергам цесна сплецена ўся гісторыя Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі. Можна толькі ўявіць, якая адказнасць кладзецца на плечы Максіма Расохі. Сёлета ён не толькі дырыжыраваў, але і ўзначаліў журы Нацыянальнага конкурсу маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні.

У размове з журналістамі маэстра прызнаўся, што ў яго вялікі вопыт працы з творчай моладдзю, ён выкладчык са шматгадовым стажам, пэўны час узначальваў аркестравы факультэт Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Здаецца, патэнцыяльных пераможцаў ён вызначыў для сябе літаральна з першага тура:

– На сцэне адразу відаць, хто справіўся, а хто крыху разгубіўся, хто ў сабе няўпэўнены.

Перамогу заваявала 24-гадовая магіляўчанка Ганна Рыбакова. Ёй уручылі Гран-пры і спецыяльны прыз імя Уладзіміра Мулявіна – крыштальную гітару. Ганна скончыла Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Аркадзя Куляшова па спецыяльнасці «музычнае мастацтва, рытміка і харэаграфія», працуе настаўнікам і сама працягвае вучыцца – бярэ ўрокі спеваў.

Гэта яе другая спроба трапіць на музычны алімп у Маладзечне:

– Старанна цэлы год рыхтавалася, займалася, адкрывала для сябе новыя вакальныя прыёмы. І вось супольнай працай з маім педагогам усё атрымалася! Я шчыра імкнулася праз эмоцыі данесці сэнс песні і зрабіць усё, што ў маіх сілах.

Няпроста ахвяраваць цэлы год дзеля перамогі, каб абысці 20 сапернікаў-канкурсантаў з усіх куткоў краіны. Што наперадзе? Вядома ж, вялікая творчая праца, удасканаленне выканаўчага майстэрства, новыя вяршыні. Пажадаем Ганне поспеху!

Публіка ў Летнім амфітэатры сустрэла вердыкт журы з яўным задавальненнем, і гэта вялікі глядацкі аванс для таленавітай дзяўчыны.

## У партале часу

Быць на фестывалі ў Маладзечне і не наведаць «Горад майстроў» у цэнтры горада, побач з галоўнымі фестывальнымі лакацыямі – немагчыма і… недаравальна. Тут шматлюдна, цікава і весела. У гаманкім натоўпе заўважаю знаёмы твар: Юрый Горлаў, старшыня Маладзечанскага райвыканкама.

Фестывальны «Горад майстроў» – шматлюдны, цікавы і вясёлы





Як тут не згадаць коласаўскія радкі са знакамітай паэмы «Сымон-музыка»: «Слухаў хлопчык тое гранне, пад сабой не чуў зямлі…»



Людзі і лялькі: маладзечанская мастачка Антаніна Невяро

– Кампазіцыі, якія ўсталяваны на пешаходнай вуліцы Прытыцкага, з розных рэгіёнаў нашай краіны, – бярэ на сябе ролю экскурсавода Юрый Мікалаевіч. – Бачыце, яны звязаны з Годам гістарычнай памяці. І хочацца прайсціся, пабыць усюды, каб пабачыць і адчуць рэгіянальныя адметнасці нашай агульнай беларускай культуры.

Ісці па прыгожай, святочнай вуліцы ды яшчэ ў кампаніі такога цікавага суразмоўцы – адно задавальненне!

***«Нам гэта неабходна – не забывацца, з чаго ўсё пачыналася. Карані – вось што галоўнае».***

– Культура – гэта неад´емная частка чагосьці роднага. Таму казаць пра тое, чыя тут заслуга, нават няёмка, – разважае старшыня райвыканкама. – Безумоўна, мы садзейнічаем, падтрымліваем. І кажам людзям пра тое, што ў гэта трэба пагружацца і яшчэ больш старанна вывучаць гісторыю і культуру роднага краю.

Фестываль Юрыю Мікалаевічу падабаецца, ён відавочна ім ганарыцца. І падкрэслівае:

– Нам гэта неабходна – не забывацца, з чаго ўсё пачыналася. Карані – вось што галоўнае. Карані нашай краіны, славутых людзей. Пра гэта трэба думаць штодня.

Літаральна некалькі крокаў – і знаёмімся з маладзечанскай мастачкай Антанінай Невяро. Яна размясцілася на драўлянай лаўцы са сваімі аўтарскімі лялькамі, з мальбертам. Кажа, што апроч жывапісу і лялек, тчэ габелены і піша вершы.

– У мяне чатыры калектыўныя зборнікі! – хваліцца.

Мастачка і паэтка, можна сказаць, ветэран фестывалю, бывае тут штораз і з усмешкай дзеліцца сваімі назіраннямі:

– Да сувеніраў цікавасць у людзей нязменная, а вось да партрэтаў меншая, бо ва ўсіх фотаапараты, і людзі фатаграфуюцца з маімі лялькамі. Партрэт – гэта цяпер мастацтва для выбраных.

На развітанне яна раіць мне пазнаёміцца з майстрам па суседству:

– Ведаеце, хто гэта? Мастак і скульптар з Віцебска, аўтар вядомай скульптуры Ефрасінні Полацкай, а таксама Міхаіла Архангела ля Чырвонага касцёла.

Так я ледзь не пазнаёмілася з Ігарам Голубевым, але ён быў заняты, і я пайшла далей, на другі бок вуліцы, дзе маладзечанскі майстра лозапляцення Святлана Дылеўская расказала шмат цікавостак пра сваю любімую справу.

Было шкада развітвацца з гэтымі цудоўнымі і шчырымі людзьмі, але заставалася некалькі хвілін да канцэрта адкрыцця, і я паспяшалася ў Летні амфітэатр, куды цякла няспынная і шырокая людская рака. Таленавіты, прыгожы і руплівы Маладзечна гасцінна і прыязна, як заўжды, сустракаў гасцей…

***Юлія НАРАЧАНКА***

***Фота аўтара і БЕЛТА***